Інфармацыя
ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу"
аб метадычных выданнях

| Месяц, калі выдадзены | Вокладка (фота) | Назва метадычнага выдання, анатацыя, адказны за выпуск, кантакты |
|---|---|---|
| Май 2025 г. |  | У маі 2025 г. выдадзены зборнік сцэнарных матэрыялаў "Сям'я – аснова патрыятычнага выхавання асобы", куды ўвайшлі сцэнарыі мерапрыемстваў аддзелаў і філіялаў ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу", праведзеных у рамках раённага конкурсу на лепшае мерапрыемства па фарміраванню культуры сямейнага дасуга "Сям'я – аснова патрыятычнага выхавання асобы". Конкурс праходзіў з лютага па май 2024 г. у рамках Года якасці. У рамках конкурсу адбыліся мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне сувязей паміж пакаленнямі, умацаванне ідэй патрыятызму ў сем'ях, цікавасць бацькоў і дзяцей да патрыятычнай |

| | | |
|---|---|---|
| | | тэматыкі, стварэнне ўмоў для рэалізацыі творчай актыўнасці сем'яў у напрамку патрыятычнага выхавання.<br>Зборнік сцэнарных матэрыялаў “Сям'я – аснова патрыятычнага выхавання асобы” выдадзены з мэтай папулярызацыі працы аддзелаў і філіялаў ДУК “Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу” з сем'ямі і далейшага выкарыстання іх.<br>Адказны: Паляк В.В. (80159568004) |
| Май 2025 г. |  | Буклет “Жамчужная зорка – палац Умястоўскіх” (аб брэндавым мерапрыемтсве – фэсце “Жамчужная зорка – палац Умястоўскіх” у аг. Жамыславль).<br>Адказны: Лугіна С.М. (80159568004) |

| | | |
|---|---|---|
| Люты 2025 г. |  | У першым паўгоддзі 2025 года быў распрацаваны буклет “Узорныя і народныя аматарскія калектывы Іўеўшчыны”.<br>Адказны: Лугіна С.М. (80159568004) |

| | | |
|---|---|---|
| Верасень 2025 г. |  | Да пацверджання ганаровага звання “народны” народнымі аматарскімі калектывамі былі створаны буклеты і праграмы.<br>Адказны: Паляк В.В., загадчык аддзела метадычнай работы (80159568004), Цыбулька-Вайцеховіч А.А., намеснік дырэктара (80159560725) |

<table>
<tr>
<td></td>
<td>
</td>
<td></td>
</tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| |  Сектар культуры<br>Іўеўскага райвыканкама<br>Дзяржаўная ўстанова культуры<br>“Іўеўскі цэнтр<br>культуры і вольнага часу”<br>Народны<br>драматычны тэатр<br>2025 год<br>Сектар культуры Іўеўскага райвыканкама<br>ДУК «Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага<br>часу»<br>СПАДЧЫНА<br>народны ансамбль народнай<br>песні філіяла аг. Лаздуны 1<br>ДУК “Іўеўскі цэнтр<br>культуры і вольнага часу”<br>2025 | |

| | | |
|---|---|---|
| | <br>Сектар культуры<br>Іўеўскага райвыканкама<br><br>Дзяржаўная ўстанова культуры<br>“Іўеўскі цэнтр<br>культуры і вольнага часу”<br><br>Народны хор<br><br>2025 год | |

| | | |
|---|---|---|
| | <br>Сектар культуры Іўеўскага райвыканкама<br>ДУК «Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу»<br>“Вечарніца”<br>фальклорны ансамбль<br>2025 г. | |

| | | |
|---|---|---|
| Жнівень 2025 г. |   | Распрацаваны буклет з рэцэптамі “Традыцыі гатавання страў з таркаванай бульбы на Іўеўшчыне” ад носьбітаў элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны “Стравы з таркаванай бульбы (дранікі, бульбяныя бліны, бабкі і іншыя) – традыціі прыгатавання і ўжывання ў Гродзенскай вобласці”. Жадаючыя могуць азнаёміцца з традыцыйнай кухняй Іўеўскага рэгіёну і даведацца сакрэты прыгатавання страў з цёртай бульбы.<br>Адказны: Паляк В.В. (80159568004) |

<table>
<tr>
<td>Кастрычнік 2025 г.</td>
<td>
</td>
<td>У мэтах захавання і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Іўеўшчыны створаны ахоўныя дошкі, а таксама рал апы: «Стравы з таркаванай бульбы (дранікі, бульбяныя бліны, бабкі і іншыя» – традыцыі прыгатавання і ўжывання ў Гродзенскай вобласці»; «Выраб мугіроў у Іўеўскім раёне»; «Традыцыі свята «Тры каралі».<br>Адказны: Паляк В.В. (80159568004)</td>
</tr>
</table>


РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ
«ТРАДЫЦЫІ СВЯТА «ТРЫ КАРАЛІ»
Арэал бытавання ў Іўеўскім раёне:
в. Сцігане, аг. Трабы, аг. Ліпнішкі
Трабы
Сцігане
Іўе
На Іўеўшчыне старадаўні абрад калядавання «Тры Каралі» бытаваў у вёсцы Сцігане (Ліпнішкаўскі сельсавет) яшчэ ў першай палове XX ст.
З успамінаў жыхароў вёскі:
«Традыцыйна на свята «Тры Каралі» хадзілі толькі хлопцы, якія мелі добрыя галасы (хораша спявалі). Прыбіраліся ў вывернуты кажух, спявалі пад вокнамі».
Перавагу аддавалі тым гаспадарам, у каго ў доме былі дзяўчаты на выданні.
З мэтай вяртання да вытокаў у філіяле аг. Трабы дзяржаўнай установы культуры «Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу» праводзяць старадаўні абрад калядавання «Тры Каралі».
6 студзеня мужчыны ў сімвалічных уборах персанажаў Трох Каралёў наведваюць дамы мясцовых жыхароў з навіной аб радаснай падзеі, віншуюць са святам, спяваюць калядныя песні, жадаюць здароўя і дабрабыту.
Гродзенская вобласць, г. Іўе, вул. 1 Мая, д. 2
Тэл.: 8 (01595) 68017
Эл. пошта: guk.rdk@ivie-lib.by



РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ
«Стравы з таркаванай бульбы.
Традыцыі прыгатавання і ўжывання
ў Гродзенскай вобласці»
Арэал распаўсюджвання
ў Іўеўскім раёне:
аг. Лелюкі, г. Іўе, аг. Ліпнішкі, в. Бакшты
Іўе
Бакшты
Папулярызацыя прыгатавання і ўжывання страваў з таркаванай
бульбы ажыццяўляецца на брэндавых мерапрыемствах Іўеўшчыны.
Дакрануцца да вытокаў беларускіх традыцый можна
на фестывалі вясковай культуры "Бакштаўскі каларыт"
ў в. Бакшты. Гасцям прапануецца "Фастфуд па-вясковаму"
з дэгустацыяй страў з таркаванай бульбы.
На брэндавым свяце "Ліпнішкаўскія сенакосы" ў аг. Ліпнішкі
бульбяныя стравы можна пакаштаваць на сялянскай пляцоўцы
"Прысмакі па-беларуску".
На гастрафэсце "Бульбачка Смятанаўна запрашае"
ў аг. Лаздуны 1 праходзіць конкурс-дэгустацыя "Бульбяны смак"
на самы смачны і вялікі дранік. Падчас свята дзейнічае тэматычная
пляцоўка "Бульбяная кавярня".
На Іўеўшчыне носьбітамі і прадаўжальнікамі традыцыі прыгатавання
і ўжывання страў з таркаванай бульбы з'яўляюцца гаспадыні:
Наталля Чакавая (дранікі па-лелюкінску)
Валянціна Буцько (дранікі)
Алена Нехведовіч (бульбяныя аладкі)
Святлана Варанюк (дранка па-бакштаўску)
Дранка па-бакштаўску
Гродзенская вобласць, г. Іўе, вул. 1 Мая, д. 2
Тэл.: 8 (01595) 68017
Эл. пошта: guk.rdk@ivie-lib.by